СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2016 г. АЎТОРАК № 57 (28167) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Філасофія армянскага танца**



**Падаходны падатак за родзічаў?**

СТАР. 17



**Падарожнік па савецкіх тунэлях**

СТАР. 19

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ілона ЛЯДНІЦКАЯ, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый, член праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Сітуацыя з укладамі насельніцтва стабілізуецца. Сёння назіраецца станоўчая дынаміка. За 23 сакавіка дні рэшткі па тэрміновых банкаўскіх укладах фізічных асоб у нацыянальнай валюце павялічыліся на Br132,3 млрд, або на 0,5%, і на 24 сакавіка склалі Br24,4 трлн. Датэрміновае скасаванне ўкладаў не мае масавага характару. У асноўным сродкі здымаюць на куплю валюты, аблігацый банкаў і Міністэрства фінансаў, набыццё нерухомасці, аўтамабіля, вядзенне бізнесу».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 20119,00 ▼ |
| Еўра | 22494,00 ▼ |
| Рас. руб. | 296,95 ▼ |
| Укр. грыўня | 770,84 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Дзень, поўны радасці, настаў...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна любяць на Вялікдзень спраўляць «Вэсолы» — калі валачобнікі абыходзяць хаты. Пасля і старыя, і малыя пачынаюць гуляць у біткі, як, напрыклад, мясцовыя старшакласнікі Алег УСЛОЎСКІ і Андрэй БАРЫЛА.

СТАР. 3

■ З першых вуснаў

# ПРАЦА, ПАМНОЖАНАЯ НА АДКАЗНАСЦЬ



Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» пра вясновую сесію і парламенцкія актуаліі

***— Уладзімір Паўлавіч, на што вы сарыентуеце дэпутатаў ва ўступным слове пры адкрыцці 4 красавіка дзявятай сесіі?***

— На актыўную, вельмі напружаную і плённую працу. Тэрмін паўнамоцтваў цяперашняга складу парламента сёлета заканчваецца, мы прыкладзём максімум намаганняў, каб сесія і ўся наша кадэнцыя завяршыліся рэзультатыўна.

***— Колькі законаў мяркуеце прыняць?***

— Клапоцімся перш за ўсё пра іх высокую якасць, адпаведнасць задачам сацыяльна-эканамічнага развіцця, бяспекі краіны і патрабаванням Прэзідэнта. У прыкладной сесійнай тэматыцы цэнтральным пытаннем з'яўляецца абмеркаванне Праграмы дзейнасці ўрада Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады. Асабліва важныя законапраекты — аб зацвярджэнні Ваеннай дактрыны, праект Кодэкса аб культуры, блокі законапраектаў па пытаннях эканамічных адносін, праваахоўнай і судовай дзейнасці, па навацыях у заканадаўстве сацыяльнай сферы, экалогіі і прыродакарыстання, а таксама міжнародныя дакументы. Змест праекта сесійнага парадку дня даволі разнастайны і актуальны.

***— Сесія пачне сваю работу на фоне такіх турбулентных міжнародных падзей, як актывізацыя ў свеце тэрарыстычных груповак і міграцыйны крызіс у Еўропе. Ці рэзаніруюць іх наступствы ў нашым беларускім заканадаўстве?***

— Рэзаніруюць і, скажу вам, самым сур'ёзным чынам. Пацвярджэнне гэтаму — новая Ваенная дактрына, дзе ўлічаны найноўшыя пагрозы, якія вымагаюць удасканалення ваеннага будаўніцтва і ўмацавання абараназдольнасці нашай краіны, адпаведная карэкціроўка некаторых законаў аб барацьбе з тэрарызмам, па пытаннях вымушанай міграцыі.

СТАР. 2

# «Пытанні ёсць, але людзі ставяцца з паразуменнем»

Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў магіляўчан думкамі наконт лютаўскіх пераразлікаў за камунальныя паслугі. Ці ўсё там празрыста і зразумела?

**На мінулым тыдні магіляўчане пачалі атрымліваць квіткі за камунальныя паслугі з пераразлікам за студзень. У панядзелак на 30-м, цэнтральным, аддзяленні пошты ў Магілёве ажыятажу не назіралася, у касы стаялі па 3-4 чалавекі, большасць нават не з жыроўкамі. «Вось у пятніцу людзей было зашмат, — кажа начальнік аддзялення Ірына Мартыненка. — Мы працуем з 8 гадзін раніцы да 8 вечара, і народ усё ішоў. Прыходзілася нават нагадваць, што мы ўжо закрываемся».**

Студзеньскі шок, калі тарыфы на камуналку падскочылі на 40-70%, а ў квітках з'явіліся новыя радкі — за асвятленне пад'езда, санітарнае ўтрыманне, электразабеспячэнне ліфта і яго тэхабслугоўванне, людзі ўжо перажылі. Па загадзе Прэзідэнта быў зроблены перагляд кошту камунальных паслуг, каб выключыць факты злоўжывання службовымі асобамі і завышэння цэн на аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі. А жыхары атрымалі адтэрміноўку па аплаце за люты — да 5 красавіка.

Лідзія Мікалаеўна адна з тых, хто заплаціў яшчэ ў пятніцу. Сведчыць, што народу на пошце было столькі, што нават камп'ютары завісалі. Але ўсе ставіліся да тэхнічных накладак з паразуменнем. Што датычыцца кошту камунальных паслуг, то ў лютаўскім квітку цэны больш прывабныя. Прызнаецца, што, калі ў студзені атрымала квітанцыю і ўбачыла там суму ў памеры 518 тысяч, вачам не паверыла. Новая ў параўнанні з той як бальзам на душу — 320 тысяч.

СТАР. 4

# УЗМАЦНІЦЬ РАБОТУ Ў АКРУГАХ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Андрэйчанкам**

Падчас сустрэчы закрануліся пытанні падрыхтоўкі да маючых адбыцца сёлета парламенцкіх выбараў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што дэпутаты цяперашняга склікання павінны прыняць у ёй актыўны ўдзел. На думку кіраўніка дзяржавы, неабходна ўзмацніць работу ў акругах з насельніцтвам, аказаць мясцовым уладам дадатковую дапамогу ў вырашэнні рэгіянальных праблем.

Такія захады павінны паспрыяць таму, каб у новы парламент прыйшлі актыўныя, падрыхтаваныя людзі, якія змогуць вырашаць праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта праца на дзяржаву, і ў такім выпадку няма патрэбы «гуляць у нейкую незразумелую дэмакратыю». «Адказнасць наша найвышэйшая, таму што нас выбірае народ», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў задавальненне працай парламентарыяў бягучага склікання. Нягледзячы на тое, што яны завяршаюць сваю дзейнасць, Прэзідэнт заклікаў Уладзіміра Андрэйчанку не здымаць з парламенцкага кантролю актуальныя пытанні, падключаць да іх вырашэння дэпутатаў. Парламенту таксама трэба будзе завяршыць пачатае ў заканадаўчай дзейнасці і прыняць неабходныя краіне ў першую чаргу дакументы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што парламент у Беларусі заўсёды быў своеасаблівай школай кадраў. На працягу чатырох гадоў людзі тут атрымліваюць вельмі моцную падрыхтоўку, і страціць такі кадравы патэнцыял недапушчальна. Найбольш здольных, прафесійна адораных парламентарыяў пасля завяршэння дэпутацкіх паўнамоцтваў неабходна прыцягваць у народную гаспадарку, у органы кіравання, перакананы кіраўнік дзяржавы.

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт быў праінфармаваны таксама аб заканадаўчай дзейнасці і падрыхтоўцы да дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў, яе міжнароднай дзейнасці.

# АДЛЕГЛАСЦЬ ДРУЖБЕ НЕ ПЕРАШКОДА

**Аляксандр Лукашэнка мае намер сёлета наведаць з візітам Эквадор**

Пра гэта Прэзідэнт Беларусі заявіў на сустрэчы са старшынёй Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Эквадор Габрыэлай Рывадэнейрай Бурбана.

«Мне вельмі прыемна, што прадстаўніца такой геаграфічна далёкай, але вельмі блізкай па духу краіны сёння знаходзіцца ў Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што беларускі бок рыхтуецца да візіту на самым высокім узроўні ў Эквадор. У прыватнасці, прапрацоўваюцца многія пытанні, перш за ўсё гандлёва-эканамічнага плана. «Мы павінны рэалізаваць нашы дамоўленасці, дасягнутыя падчас перамоў на вышэйшым узроўні з Прэзідэнтам Эквадора Рафаэлем Карэа. І думаю, мы вельмі хутка зможам падрыхтаваць праграму візіту», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, што паміж Беларуссю і Эквадорам наладжваюцца вельмі цесныя міжпарламенцкія сувязі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт упэўнены, што гэтыя кантакты стануць асновай для развіцця ўсяго спектра беларуска-эквадорскага супрацоўніцтва: у палітыцы, гандлі, інвеставанні, прасоўванні сумесных праектаў, аб якіх бакі раней дамаўляліся.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў думку, што дабрабыт беларускага і эквадорскага народаў будзе залежаць і ад таго, наколькі абедзве краіны змогуць умацаваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, якое з'яўляецца падмуркам двухбаковых сувязяў. «Таму так старанна падчас падрыхтоўкі візіту на вышэйшым узроўні ў Эквадор ідзе прапрацоўка гандлёва-эканамічных пытанняў. Думаю, падчас вашых сустрэч у Мінску можна будзе грунтоўна пагаварыць пра гэтыя пытанні», — выказаў упэўненасць кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік эквадорскага парламента перадала Аляксандру Лукашэнку самыя цёплыя пажаданні ад Прэзідэнта Эквадора Рафаэля Карэа, які чакае візіту беларуската лідара. На перамовах Аляксандра Лукашэнкі з Габрыэлай Рывадэнейрай Бурбана быў абмеркаваны шырокі спектр беларуска-эквадорскага ўзаемадзеяння.

# СПРАВА МУЖНЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў паралімпійцаў з 20-годдзем стварэння Паралімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь**

«Ідэалы і каштоўнасці паралімпійскага спорту аб'ядноўваюць людзей мужных, мэтанакіраваных, якія паверылі ў сябе і змаглі пераадолець сваю хваробу. Асабістым прыкладам яны паказваюць, наколькі бязмежныя рэзервы чалавека і як упартасць і сіла волі робяць цуды», — гаворыцца ў віншаванні.

Віншаванне кіраўніка дзяржавы перадаў юбілярам першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Максім Рыжанкоў. Ён уручыў кіраўніку Паралімпійскага камітэта Ганаровы знак НАК.

Намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава ўручыла Паралімпійскаму камітэту Ганаровую грамату Савета Міністраў. Яна адзначыла, што не толькі ўзнагароды з'яўляюцца меркай поспеху спартсменаў з абмежаванымі магчымасцямі. Сам удзел у Паралімпіядах, чэмпіянатах свету і Еўропы — гэта ўжо вялікая перамога людзей, якія пераадолелі жыццёвыя нягоды і абставіны, яны вартыя ўсялякіх пахвал, з іх можна і трэба браць прыклад.

# ЗА ЗАСЛУГІ ПЕРАД КРАІНАЙ

**Прэзідэнт удастоіў дзяржузнагарод прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці**

Ордэнам Пашаны ўзнагароджаны генеральны дырэктар РУП «БелЭЗ» Барыс Белкін, дырэктар Рэспубліканскага культурна-асветніцкага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Гундар, намеснік міністра замежных спраў Алена Купчына, першы намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Мікалай Селіванаў.

Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і памежнай службы атрымалі медалі за адзнаку ў воінскай службе, у ахове грамадскага парадку і дзяржаўнай мяжы.

Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены 32 чалавекі. Медалём Францыска Скарыны, у прыватнасці, узнагароджаны дырэктар Інстытута гісторыі НАН Вячаслаў Даніловіч і дырэктар Інстытута філасофіі НАН Анатоль Лазарэвіч, дырэктар НІРУП «Геаінфармацыйныя сістэмы» Сяргей Залаты, загадчык кафедры Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі Уладзімір Петравец.

Акрамя таго, адпаведным указам прысвоены ганаровыя званні прадстаўнікам сфер адукацыі, медыцыны, навукі, культуры, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі і пракуратуры.

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне саветніку-кансультанту аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Курашу Аляксандру Канстанцінавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ПРАЦА, ПАМНОЖАНАЯ НА АДКАЗНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы працягваем працу па ўдасканаленні дзейнасці праваахоўных органаў і сістэмы папярэджання і прафілактыкі правапарушэнняў, прававога механізма грамадскай бяспекі. На сесіі будуць зроблены новыя крокі па развіцці крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства, у барацьбе з карупцыяй, процідзеянні незаконнаму абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Усё гэта ў комплексе накіравана на стварэнне дадатковых гарантый бяспекі асобы і грамадства, абароны правоў і свабод грамадзян, а значыць — і нацыянальнай бяспекі. З улікам сучасных выклікаў і пагроз абнавіцца даволі шырокі сегмент заканадаўчага поля.

***— Правы чалавека доўгі час з'яўляліся тэмай асаблівай прыдзірлівасці Захаду да Беларусі. Кажу «з'яўляліся» з пэўнай надзеяй, што пасля адмены санкцый Еўрасаюза і нядаўняга візіту ў нашу краіну спецыяльнага прадстаўніка ЕС па правах чалавека гэтая асаблівая прыдзірлівасць і сапраўды застанецца ў мінулым. Наколькі такое магчыма, як вы мяркуеце?***

— Магчыма настолькі, наколькі замацуецца добрая воля да дыялогу з Беларуссю і канструктыўнага пошуку шляхоў яго паслядоўнага развіцця на аснове прагматызму і здаровага сэнсу. Рэспубліка Беларусь і Нацыянальны сход гатовы весці прадметны дыялог з еўрапейскімі арганізацыямі і парламенцкімі структурамі ва ўсіх фарматах на прынцыпе ўзаемнай павагі і раўнапраўя. Ніякай зацікаўленасці ў канфрантацыі з Еўрасаюзам, Захадам ці з якой-небудзь краінай у нас няма. Гэта неадназова падкрэсліваў наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. На сустрэчах з еўрапейскімі парламентарыямі, што праходзяць на міжнародных парламенцкіх пляцоўках і ў Палаце прадстаўнікоў, мы выказваем свае погляды, у тым ліку на правы чалавека, не драматызуючы пры гэтым некаторыя адрозненні ў пазіцыях. Існуючыя пытанні трэба вырашаць канструктыўна, без нагнятання эмоцый і страсцей, бо ад развіцця процістаяння ніхто не выйграе. Мяркуючы па пацяпленні адносін Еўрасаюза да Беларусі і адмене абмежавальных мер у дачыненні да нашай краіны, у ЕС над гэтым пачалі задумвацца. Падчас гутаркі ў парламенце са спецпрадстаўніком ЕС па правах чалавека Стаўрасам Ламбрынідзісам я адзначыў, што ёсць добрая магчымасць вывесці нашы стасункі на новы ўзровень.

***— З удзелам спецпрадстаўніка Еўрасаюза ў Мінску адбылася міжнародная канферэнцыя «Смяротнае пакаранне: пераадоленне рознагалосся». На ваш погляд, што неабходна для таго, каб рознагалоссе было знята ці хоць бы паменшылася?***

— Трэба працягваць інфармацыйную і растлумачальную работу, каб гэтая тэма паступова перастала быць прадметам грамадскіх дыскусій, была зразумелай і яснай кожнаму грамадзяніну, а не толькі юрыстам і актыўнаму палітычнаму асяродку. У чым мне бачыцца сутнасць пытання? Беларускі народ на сваіх гістарычных скрыжалях перанёс шмат войнаў, варожых навалаў, рознага ліхалецця. Якіх страшэнных пакутаў і велізарнай ахвярнасці запатрабавала Вялікая Айчынная вайна! Таму ў нашай краіне так высока цэніцца мірнае, спакойнае, стабільнае жыццё, законнасць і грамадскі парадак. Людзі ў абсалютнай большасці законапаслухмяныя, не прымаюць варварства, маральнага дзікунства, агрэсіі і ахлакратыі, лічаць недапушчальным ваяўнічы радыкалізм і экстрэмізм. Ім не ўсё роўна, што адбываецца ў іх дзяржаве, нясуць ці не нясуць жорсткія злачынцы законныя і справядлівыя пакаранні, не проста дзеля адплаты за асабліва цяжкія злачынствы, а дзеля захавання мірнага, бяспечнага жыцця краіны, яго надзейнай абароненасці. Таму, мяркую, не трэба праяўляць нецярплівасці да тэмпаў фарміравання адзінай грамадскай думкі па такім важным для беларускіх грамадзян пытанні. Гэта не з'яўляецца непераадольнай перашкодай для развіцця дыялогу і пашырэння супрацоўніцтва Беларусі і Еўрасаюза па тых праграмах, якія рэалізуюцца, і па новых.

***— Калі ўявіць, што Парламенцкая асамблея Савета Еўропы адновіць для Нацыянальнага сходу Беларусі статус спецыяльна запрошанага, то што гэта дасць нашаму парламенту?***

— У сваёй дзейнасці, у тым ліку ў міжпарламенцкіх і міжнародных адносінах, мы кіруемся не ўяўленнямі, а палітычнымі і жыццёвымі рэаліямі. Аднаўленне статусу спецыяльна запрошанага было б разумным крокам ПАСЕ па шляху ўмацавання нашых кантактаў. А кантакты між парламентарыямі, палітыкамі, як і ўвогуле між людзьмі, маюць вялікае, я сказаў бы, вырашальнае значэнне для паразумення па складаных пытаннях. Узаемаадносіны напрамую — самы лепшы шлях да ўзаемнага даверу, што вельмі важна для зацікаўленага і паважлівага дыялогу па актуальным парадку дня. Думаю, гэта было б карысна абодвум бакам — і Нацыянальнаму сходу Беларусі, і ПАСЕ.

***— Міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў у апошнія гады прыкметна актывізавалася. Толькі за гэты міжсесійны перыяд, наколькі я ў курсе, з удзелам дэпутатаў адбылося каля 20 міжнародных мерапрыемстваў у розных фарматах. Нядаўна беларуская парламенцкая дэлегацыя, якую вы ўзначальвалі, пабывала з афіцыйным візітам у Тайландзе. Якія ёсць магчымасці супрацоўніцтва з гэтай краінай?***

— Яны даволі значныя. Каралеўства Тайланд уваходзіць у АСЕАН, і яе рынак дазваляе пашыраць наш экспарт у Паўднёва-Усходняй Азіі. Асабліва перспектыўныя сферы дзелавога партнёрства — гандаль, прамысловасць, сельская гаспадарка, навука, тэхніка, адукацыя і культура. Пра гэта мы гаварылі на перамовах з прэм'ер-міністрам Тайланда і Старшынёй Нацыянальнага заканадаўчага сходу, на сустрэчах са старшынямі гандлёвай палаты, федэрацыі прамысловых прадпрыемстваў, асацыяцыі вытворцаў замарожаных харчовых тавараў Тайланда і на першым беларуска-тайландскім бізнес-форуме, праведзеным у Бангкоку. З абодвух бакоў выказаны канкрэтныя прапановы па далейшым развіцці ўзаемадзеяння з акцэнтам на яго практычных выніках. Мы абмеркавалі пытанні фарміравання дагаворна-прававой базы, развіцця прамысловай кааперацыі, навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння і іншыя. Своеасаблівай дарожнай картай міжпарламенцкага супрацоўніцтва стане Пагадненне, якое падпісана мною і Старшынёй Нацыянальнага заканадаўчага сходу Тайланда. Яно дапаможа наладжванню трывалых міжпарламенцкіх кантактаў як на двухбаковым узроўні, так і на міжнародных парламенцкіх пляцоўках.

***— Некалькімі словамі, чым вас найбольш уразіла паездка ў Тайланд?***

— Дружалюбным, добразычлівым стаўленнем да Беларусі ўсіх, з кім мы сустракаліся і гутарылі. Тут ведаюць, што наш Прэзідэнт выступае за маштабнае супрацоўніцтва з Тайландам, цэняць беларускую прадукцыю і зацікаўлены ў развіцці сур'ёзнага рознабаковага партнёрства з нашай краінай.

***— Уладзімір Паўлавіч, вы з'яўляецеся першым намеснікам Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Парламенцкі Сход сёлета юбіляр — яму споўніцца 20 гадоў. На вашу думку, што самае адметнае за гэты перыяд у саюзным будаўніцтве?***

— У параўнанні з пачаткам збліжэння дзвюх краін інтэграцыя выйшла на якасна больш высокі віток, што праяўляецца ў паэтапным нарошчванні супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, асабліва ў эканоміцы, сацыяльнай палітыцы, абароне, бяспецы, праваахоўнай дзейнасці, навуцы і ў рэгіянальным узаемадзеянні. Яно развіваецца на шырокай дагаворна-прававой базе, прыносіць абедзвюм краінам выгаду і практычную карысць беларусам і расіянам. Прычым у працэсе ажыццяўлення саюзнага праекта суверэнітэт і незалежнасць Беларусі і Расіі не змяншаюцца, не знікаюць, а атрымліваюць новыя магчымасці ўмацавання і развіцця. У гэтым унікальнасць ствараемай на аснове раўнапраўя Саюзнай дзяржавы як эфектыўнага міждзяржаўнага аб'яднання. Яго вопыт паказаў, у чым нашы краіны могуць арганічна дапаўняць адна адну, аб'ядноўваючы свае матэрыяльныя і інтэлектуальныя рэсурсы, і што можа быць інтэграцыйным прыкладам для іншых краін еўразійскай прасторы.

***— Як вы ацэньваеце ролю Парламенцкага Сходу?***

— Парламенцкі Сход з'яўляецца пляцоўкай, на якой беларускія і расійскія парламентарыі зацікаўлена абмяркоўваюць найбольш важныя інтэграцыйныя пытанні, дыскутуюць і прымаюць узгодненыя рашэнні, у тым ліку па саюзным бюджэце, саюзных праграмах і мерапрыемствах, міжнароднай дзейнасці. Хоць склад Парламенцкага Сходу перыядычна абнаўляецца, усе дэпутаты актыўныя прыхільнікі інтэграцыі і праводзяць вялікую работу, накіраваную на паглыбленне супрацоўніцтва нашых краін. А яно асабліва неабходна ва ўмовах разнастайных сучасных выклікаў і імклівых перамен на сусветнай арэне.

***— Не за гарамі выбары ў Палату прадстаўнікоў шостага склікання. Аб падрыхтоўцы да іх ужо заявілі шэраг партый і грамадскіх арганізацый. Якой вам бачыцца маючая адбыцца выбарчая кампанія?***

— Хацелася б, каб яна прайшла цывілізавана, дэмакратычна, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. Каб будучыя суіскальнікі дэпутацкіх мандатаў ясна ўсведамлялі, дзеля чаго яны імкнуцца ў парламент, што могуць зрабіць для людзей і краіны, разумелі канстытуцыйную сутнасць парламентарызму, мелі адпаведную падрыхтаванасць да заканатворчай і прадстаўнічай работы, бо толькі працаздольны, настойлівы, актыўны і адказны парламент можа эфектыўна працаваць у інтарэсах простага чалавека, грамадства і дзяржавы.

***— Выбарчая кампанія не ўнясе дысанансу ў завяршальны этап дзейнасці цяперашніх дэпутатаў?***

— Не ўнясе. У нас яшчэ многа адказных спраў, і мы будзем імі рупліва, належным чынам займацца.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫШЭЙ ЗА ЭКВАТАР

## БЕЛАРУСЬ І ЭКВАДОР РОБЯЦЬ КРОКІ НАСУСТРАЧ

**Учора нашу краіну ўпершыню за гісторыю двухбаковага супрацоўніцтва наведала парламенцкая дэлегацыя гэтай рэспублікі. Падчас афіцыйнага візіту замежныя парламентарыі правялі перамовы са спікерамі абедзвюх палат беларускага парламента, напрыканцы чаго былі падпісаны пагадненні аб далейшай працы паміж Нацыянальным сходам Беларусі і Лацінаамерыканскім парламентам (ПАРЛАЦІНА), а таксама беларускім і эквадорскім парламентамі.**

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў,** адзначыў, што Беларусь зможа прыняць актыўны ўдзел у мадэрнізацыі эканомікі, якая цяпер праводзіцца ў Эквадоры. «Напрыклад, мы маглі б пастаўляць кар'ерную тэхніку», — прапанаваў ён і дадаў, што перспектыўнымі кірункамі могуць стаць продаж беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі і ўдзел ва ўзвядзенні лініі электраперадач. Пры гэтым узаемны тавараварот у 77 мільёнаў долараў у мінулым годзе відавочна можна павялічыць — магчымасцяў для гэтага дастаткова.

На думку **старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА,** парламенцкае вымярэнне ўзаемаадносін дазваляе весці паўнавартасны дыялог паміж нашымі дзяржавамі. Ён станоўча ацаніў яго ўзровень: «Мы дамовіліся, як прасоўваць тыя праекты, якія ёсць сёння. Асабліва ў вобласці нафтаперапрацоўкі, выкарыстання нетраў і актывізацыі пытанняў, звязаных з супрацоўніцтвам у сферы аграпрамысловага комплексу». Сенатар падкрэсліў, што на гэты момант важна скончыць працу па падпісаных раней пагадненнях і прыступіць да заключэння новых, з якіх асноўныя — аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, абароне інвестыцый і ўзаемным прызнанні дыпломаў ВНУ.

Эквадорская дэлегацыя ганарыцца фактам візіту ў Беларусь, запэўніла старшыня Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Эквадор Габрыэла Рывадэнейра Бурбана. «Супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў павагі свабоды, праву чалавека, суверэнітэту. Хацелася б зазначыць той факт, што размова ідзе пра народы Лацінскай Амерыкі, якія на працягу працяглага часу знаходзіліся на задворках гісторыі. Сёння вельмі важна, што наша супрацоўніцтва адбываецца на раўнапраўным узроўні для захавання мультыпалярнасці свету», — лічыць эквадорскі парламентарый.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Меркаванне

# Жанчыны — у 58, мужчыны — у 63

**Такі варыянт павышэння пенсійнага ўзросту назвала на днях найбольш прымальным міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА пасля нарады ў Прэзідэнта па гэтым пытанні. Нагадаем, што Прэзідэнт Беларусі збіраецца падпісаць адпаведны ўказ ужо на гэтым тыдні.**

Навіна шырока абмяркоўваецца і спецыялістамі, і звычайнымі людзьмі. Так, **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір ВАСІЛЕНКА** лічыць рашэнне аб павышэнні пенсійнага ўзросту на тры гады для жанчын і мужчын найбольш прымальным і ўспрымальным, і ў першую чаргу, з-за паэтапнасці.

«Такое рашэнне, як мне здаецца, будзе больш стрымана ўплываць на змены на рынку працы і будзе садзейнічаць стабільнасці пенсійнай сістэмы, што ў сваю чаргу дазволіць наканаць абавязацельствы па выплаце пенсій усё большай колькасці пенсіянераў, а з цягам часу, магчыма, дабіцца і росту пенсій, — сказаў дэпутат «Звяздзе». — Цяпер, прымаючы пад увагу той факт, што памеры пенсій у любой краіне залежаць ад магчымасцяў нацыянальнай эканомікі іх фінансаваць і колькасці пенсіянераў, казаць пра далейшыя планы, на мой погляд, заўчасна. У народзе гавораць: «Пажывём — пабачым». Але яшчэ раз адзначу, што толькі інтэнсіўны эканамічны рост дазволіць забяспечыць большую напоўненасць рэальнага зместу як зарплат, так і сацыяльных выплат.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Узаемадзеянне

# У ІНТАРЭСАХ МІРУ І БЯСПЕКІ

**Пасяджэнне Камітэта начальнікаў штабоў узброеных сіл дзяржаў — удзельніц СНД сабрала ў беларускай сталіцы дэлегацыі ваенных ведамстваў Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. Рашэнні, прынятыя падчас пасяджэння, накіраваны на ўдасканаленне сістэмы шматбаковага ваеннага супрацоўніцтва ў фармаце Садружнасці Незалежных Дзяржаў і садзейнічаюць развіццю ўстойлівага партнёрскага ўзаемадзеяння ў ваеннай сферы.**

У ходзе пасяджэння былі вызначаны асноўныя кірункі і мерапрыемствы па рэалізацыі Канцэпцыі ваеннага супрацоўніцтва дзяржаў — краін Садружнасці да 2020 года. У прыватнасці, начальнікі генеральных штабоў абмеркавалі ўдзел камандаў узброеных сіл краін — удзельніц СНД у Армейскіх міжнародных гульнях 2016 года, ухвалілі асноўныя кірункі ўзаемадзеяння службаў аховы дзяржаўнай тайны і тапаграфічных службаў, вызначылі шляхі далейшага супрацоўніцтва ў межах Аб'яднанай сістэмы кантролю і ацэнкі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абстаноўкі, разгледзелі праект пагаднення аб Сумеснай (аб'яднанай) сістэме сувязі. У выніку было вырашана больш за 10 пытанняў.

— Прынятыя ў межах сённяшняга пасяджэння рашэнні будуць садзейнічаць удасканаленню сістэмы шматбаковага ваеннага супрацоўніцтва ў фармаце Садружнасці і развіццю ўзаемавыгаднага партнёрскага ўзаемадзеяння ў ваеннай сферы на аснове ўліку агульных рэгіянальных і нацыянальных інтарэсаў, — падкрэсліў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — **першы намеснік міністра абароны Беларусі, генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Улічваючы важнасць і актуальнасць развіцця інтэграцыйных працэсаў у ваеннай сферы, асаблівая ўвага была нададзена пытанням практычнай рэалізацыі зацверджаных планаў і рашэнняў, а таксама рэалізацыі палажэнняў Канцэпцыі ваеннага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД да 2020 года.

Як заявіў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Расійскай Федэрацыі, генерал арміі Валерый ГЕРАСІМАЎ,** для супрацьдзеяння сучасным выклікам і пагрозам неабходна кансалідаваць нашы намаганні ў ваеннай галіне, прымаць прэвентыўныя меры па папярэджанні распаўсюджвання дзейнасці радыкальных тэрарыстычных арганізацый на тэрыторыі СНД. Каментуючы праведзеную Паветрана-касмічнымі сіламі Расіі аперацыю ў Сірыі, ён адзначыў, што ўдар па тэрарыстах станоўча ўплывае на дзеянні наземных груповак урадавых войскаў і атрадаў апалчэння.

Акрамя таго, начальнік Генштаба расійскай арміі расказаў, што пазаўчора пры падтрымцы Паветрана-касмічных сіл Узброеных Сіл Расіі, сіл спецыяльных аперацый і пры ўдзеле ваенных саветнікаў была вызвалена Пальміра — найважнейшы культурны цэнтр. «Вызваленне горада мае стратэгічнае значэнне ў барацьбе з тэрарызмам у Сірыі, — перакананы Валерый Герасімаў. — У адпаведнасці з рашэннем Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, нашы інжынерныя войскі, у прыватнасці падраздзяленні міжнароднага супрацьмінннага цэнтра, будуць выконваць задачы па размініраванні Пальміры».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Дажджліва і ветрана



**Апошні тыдзень сакавіка адзначыцца ў нашай краіне цёплым і няўстойлівым надвор'ем, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, таму ападкаў пераважна не чакаецца, толькі ўдзень па захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 13-14 градусаў. А далей да нас завітаюць цёплыя паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы. Таму ў сераду амаль паўсюдна па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5, удзень будзе 6-12 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 14 градусаў.

Самым цёплым днём тыдня стане чацвер, калі на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, якія ўдзень будуць суправаджацца месцамі ўзмацненнем ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-8 цяпла, удзень — плюс 7-12 градусаў, па поўдні — да 16 цяпла.

Аднак у першыя дні красавіка надвор'е сапсуецца і пахаладае. Такім чынам, у пятніцу праз тэрыторыю краіны будзе рухацца больш актыўны атмасферны фронт, які прынясе нам дажджы рознай інтэнсіўнасці. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень — 3-9 цяпла, а па поўдні будзе плюс 10-13 градусаў. Кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу прагназуюцца да першай паловы дня і ў суботу. Надалей чакаецца павелічэнне атмасфернага ціску, таму ападкі пройдуць пераважна па ўсходняй палове краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Дзень, поўны радасці...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*Чырвонае кока ўжо недалёка,*
*Каліна-маліна, ягадзіца!*
*Цыбульку лупіце, яечкі хварбіце,*
*Каліна-маліна, ягадзіца!*
*Яечкі хварбіце і ўсім дзяліце,*
*Каліна-маліна, ягадзіца!*

З гэтай песняй валачобнікі ідуць па вёсцы, заходзяць у двары, стукаюцца ў дзверы. Песня пяецца гучна, каб усе пачулі, выходзілі сустракаць гасцей, выносілі асвячоныя яйкі ды кулічы. З веку ў век, з году ў год велікодная традыцыя хадзіць у валачобнікі ў Дзеркаўшчыне не страчваецца, новая генерацыя вяскоўцаў працягвае яе, пяюцца і даўнейшыя песні.

Сёлета на каталіцкі Вялікдзень дзеркаўшчынскія гаспадары таксама выходзілі на ганкі альбо запрашалі валачобнікаў у хаты. Для жыхароў гэтай вёскі валачобнікі абавязкова выконвалі песню «Вэсолы», якую ведаюць усе: ад малога да старога.

— Якая радасць вяскоўцам, калі ў іх дамы прыходзяць валачобнікі, — кажа дырэктар Цэнтра культуры Аксана Баброўская. — Таму мы падтрымліваем традыцыю віншаваць з Божым Уваскрэсеннем, атрымліваць велікодныя падарункі. Мы вучым песні, якія спявалі нашыя бабулі і прабабулі.

Гэтым разам у ролі валачобнікаў былі вучні старшых класаў Дзеркаўшчынскай школы Сняжана Ваховіч, Таццяна Іканові, Кацярына Пачакоўская, Дзмітрый Бурэнь, Алег Услоўскі, Андрэй Бервячонак і Андрэй Барыла, якія з разуменнем ставяцца да захавання гісторыі і духоўнай спадчыны сваёй малой радзімы.

А яшчэ ў гэты святочны дзень, з самай раніцы, бегаюць дзеці з кошыкамі. «Па яйкі» — гэтак у вёсцы называецца дзіцячы валачобны звычай.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**



# «M.@RT.КАНТАКТ-2016» СКАЗАЎ «БЫВАЙ»

**Падзеяй Міжнароднага тэатральнага форуму ў Магілёве стаў спектакль «Жыццё за цара» Тэатра Дзі Капуа з Санкт-Пецярбурга. Менавіта ён, на думку маладзёжнай лабараторыі крытыкаў, якая працавала на працягу фестывалю пад кіраўніцтвам польскага тэатразнаўцы Андрэя Масквіна, стаў найлепшым. За гісторыю свайго існавання спектакль упершыню прайшоў у сценах музея. Раней для гэтага выкарыстоўваліся кватэры ці нават падвалы і гарышчы. Прыемна, што зала дваранскага побыту XIX стагоддзя магілёўскага музея этнаграфіі здалася артыстам ідэальнай.**

— Нам было камфортна, і па сэнсе ўсё супала. У такіх кватэрах «нарадавольцы» якраз і жылі, — адзначыў Андрэй Жукаў, у майстэрні якога стваряўся гэты спектакль.

Нагадаем, што ў фестывальнай праграме было 20 спектакляў, прадстаўленых калектывамі з 9 краін. Найбольш цікавымі, хоць месцамі і спрэчнымі, тэатразнаўцам здаліся работы маладых рэжысёраў Ігара Казакова, Кацярыны Аверкавай, Яўгена Карнягі і Таццяны Траяновіч. Моладзь жа вызначыла пераможцаў у такой паслядоўнасці. Найлепшы малады рэжысёр — Ігар Казакоў (Магілёўскі абласны тэатр лялек, спектакль «На дне»), найлепшы малады акцёр — Максім Студзяноўскі ( «Майстэрня» Санкт-Пецярбург), найлепшая маладая актрыса — Ірына Ткачэнка («Залатыя вароты», Кіеў), найлепшая сцэнаграфія — Таццяна Нерсісян («На дне», Магілёў), найлепшая музыка — Мікіта Залатар («Інтэрв'ю з ведзьмамі», Беларускі дзяржаўны тэатр лялек) і найлепшы акцёрскі ансамбль — спектакль «Васа» («Ведагонь-тэатр», Масква). Прыз глядацкіх сімпатый атрымаў спектакль «Раскас» Маскоўскага драматычнага тэатра «Сфера».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# «Пытанні ёсць, але людзі ставяцца з паразуменнем»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ніна Іванаўна ўжо на пенсіі, жыве ў пяціпавярховіку. Кажа, што істотных змен для яе па аплаце не адбылося. Калі за студзень яна за двухпакаёўку агульнай плошчай каля 52 квадратных метраў плаціла 520 тысяч рублёў, то ў лютым — 430. Плата паменшылася ў першую чаргу за кошт пераразліку за ацяпленне і меншай колькасці дзён. З мінусам палічылі санітарнае абслугоўванне: у студзені было 22 тысячы, у лютаўскай жыроўцы — 15 тысяч. Дамафон «каштаваў» у студзені 12400, стаў 5800.

— Дарэчы, пра дамафон, — падключаецца да размовы мужчына сярэдніх гадоў. — У графе «тарыфы, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат» пазначана 14600, а там, дзе налічана па гэтай жа пазіцыі — 9100. Што б гэта значыла? А наогул мая жыроўка зусім не патаннела. Адмінусавалі крыху па санабслугоўванні, за дамафон, затое дабавілі зямельны падатак. Ёсць пытанні па аплаце праз інфакіёск. У базе захоўваюцца папярэднія даныя, але, калі ўводжу новыя, мне прыплюсоўваюць дадатковую суму пад назвай пераразлік. Адкуль ён бярэцца? Зараз, напрыклад, 17 тысяч дабавілі.

Галіна жыве ў двухпакаёўцы агульнай плошчай 54,2 квадрата. На халодную і гарачую ваду прыбораў уліку ў яе няма. «У студзені я аддала за камуналку болей за 700 тысяч, цяпер на 200 тысяч меней. На 70 тысяч патаннела ацяпленне, з 35 да 16 тысяч знізіўся кошт санітарнага абслугоўвання, на 8 тысяч менш абышлося тэхабслугоўванне і на 10 — халоднае водазабеспячэнне. Дамафон быў 13 тысяч рублёў, а стаў 9100. Плата за вываз і абясшкоджванне ТБА не змянілася. Не зразумела іншае. У канцы мінулага года ў нашым доме па вуліцы Каштанавая, 35 заварылі смеццеправоды, а смеццевыя бакі на вуліцы не паставілі. Кожны выкручваецца, як можа. Нехта кідае сваё смецце каля пад'езда, нехта на той самай пляцоўцы, дзе быў смеццеправод.

Вераніка Мікалаеўна квіток атрымала, але яшчэ не плаціла. «Да 5 красавіка час яшчэ ёсць, — аптымістычна кажа яна. — Трэба яшчэ высветліць, чаму ў нашым доме па вуліцы Першамайскай, 12 сумы па аплаце за асвятленне лесвічных пляцовак адрозніваюцца. І па ацяпленні пытанне ёсць. На нашым паверсе ва ўсіх пазначана розная колькасць гігакалорый».

Яшчэ адзін мужчына ўсё не разумеў, чаму знікла інфармацыя, колькі насельніцтва пакрывае затрат па асноўных паслугах ЖКГ. «У студзені, напрыклад, мы кампенсавалі толькі 27%, а цэны ўжо былі завоблачныя. Напэўна, вырашылі больш не шакіраваць народ», — зрабіў ён выснову.

Затое цяпер разам з жыроўкамі прыйшоў ліст з Указам Прэзідэнта №107, дзе пералічваюцца захады па абароне інтарэсаў грамадзян пры аплаце жыллёва-камунальных паслуг. Але людзям яшчэ цяжка саматойна разабрацца, чаму ў студзеньскіх квітках было разлічана так, а ў лютаўскіх панішаму, таму тэлефануюць у разлікова-касавыя цэнтры.

«Цікавяцца, чаму менавіта так налічылі, чаму сума не вельмі змянілася, — кажа начальнік службы камунальных сістэм і разлікаў Магілёўскага ЦГІС Таццяна Коршунава. — У кожнага атрымаўся свой пераразлік. Калі ў студзені мы налічвалі сумы за санітарнае абслугоўванне і электрычнасць у месцах агульнага карыстання, зыходзячы з колькасці квадратных метраў, то ў лютым ужо ў залежнасці ад колькасці людзей, якія пражываюць. У студзені выстаўлялі фактычныя сумы, а цяпер з улікам гранічных паказанняў. Мінус адбыўся ў асноўным па трох пазіцыях — поўная кампенсацыя эканамічна абгрунтаваных затрат на тэхабслугоўванне жылога дома, тэхнічнае абслугоўванне ліфта і дамафон, плата за карыстанне якім не павінна перавышаць 9,1 тысячы рублёў.

Для камунальнікаў цяпер таксама няпросты час. У Магілёўскім ЦГІСе паставілі своеасаблівы рэкорд — за 52 гадзіны пералічылі ўсе квітанцыі Магілёва і Магілёўскага раёна.

— Суцяшае толькі тое, што большасць насельніцтва паставілася да перамен па аплаце з разуменнем. У суботу сама бачыла, як у ашчаднай касе людзі адстойвалі вялікія чэргі, каб заплаціць за камуналку, — кажа Таццяна Мікалаеўна.— Засталося пражыць красавік, бо квіткі мы разашлём ужо да 15 красавіка, а адтэрміноўкі па аплаце не будзе.

Па некаторых пазіцыях пераразлікі за люты яшчэ адбудуцца. З 26 сакавіка ўступіла ў сілу пастанова Саўміна №233, дзе ўносяцца карэктывы ў парадак разлікаў. Акрамя гэтага, уступіла ў дзеянне рашэнне Магілёўскага аблвыканкама, дзе зацверджаны фіксаваныя тарыфы на ЖКГ, субсідаваныя дзяржавай, якія таксама забяспечваюць поўную кампенсацыю абгрунтаваных затрат на іх аказанне.



Магіляўчанка не разумее, чаму на адным паверсе іх дома колькасць гігакалорый на ацяпленне не аднолькавая.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Будзьце ў курсе!

## НОВЫЯ ГРАНІ КОНКУРСУ ЯКАСЦІ

**Выяўленню якасных, бяспечных і канкурэнтаздольных тавараў і паслуг, у тым ліку новых відаў, а таксама іх прасоўванню на ўнутраны і знешні рынкі садзейнічае конкурс «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь»**

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржстандарта, сёлета ў межах конкурсу ўведзены дзве дадатковыя спецыяльныя ўзнагароды — «Найлепшы ў галіне» і «Найлепшы ў рэгіёне». Такімі ўзнагародамі будуць адзначацца высокія вынікі ў паляпшэнні якасці і бяспекі тавараў, дасягнутыя пераможцамі ў галіне і рэгіёне адпаведна. Узнагароды «Найлепшы ў галіне» могуць быць удастоены лаўрэаты конкурсу, якія набралі найбольшую колькасць балаў у асобным галіновым кірунку. Прэтэндаваць на прысуджэнне спецыяльнай узнагароды «Найлепшы ў рэгіёне» змогуць лаўрэаты конкурсу, якія набралі найбольшую колькасць балаў у сваім рэгіёне.

Цяпер на другім этапе конкурсу — рэспубліканскім — у спажыўцоў з'явіцца магчымасць пакінуць свае водгукі ў дачыненні да фіналістаў і якасці іх прадукцыі і паслуг, заяўленых на конкурс. Для атрымання заўваг ад спажыўцоў сакратарыят рэспубліканскай конкурснай камісіі не пазней, чым за два тыдні да падвядзення, будзе размяшчаць на сайце Дзяржстандарта пералік фіналістаў.

Таксама не абмяжоўваецца колькасць заяўленых на конкурс відаў тавараў адным канкурсантам.

Чарговы, пятнаццаты конкурс «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь — 2016» будзе абвешчаны ў найбліжэйшы час.

**Дар'я ШОЦІК**

■ Небяспека

## ДАЧНІЦА ЎЧЫНІЛА БУЙНЫ ПАЖАР У ВЁСЦЫ

**Удзень паведамленне аб загаранні травы на «101» паступіла з вёскі Паняцічы Вілейскага раёна. Праз 11 хвілін, знаходзячыся ў дарозе, падраздзяленні МНС атрымалі інфармацыю пра тое, што ад травы загарэўся дом. Да месца пажару неадкладна была выслана дадатковая тэхніка.**

Калі ратавальнікі прыбылі ў вёску, адкрытым полымем гарэлі тры дамы і чатыры гаспадарчыя пабудовы, паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. Падчас высвятлення абставін здарэння стала вядома, што 66-гадовая гаспадыня аднаго з дачных дамоў наводзіла парадак на сваім прысядзібным участку. Прыбранае смецце жанчына вырашыла спаліць у полі, у выніку чаго адбылося загаранне сухой расліннасці. Ад моцнага ветру агонь пачаў распаўсюджвацца ў бок дамоў. За лічаныя хвіліны ён ахапіў дамы і хлявы на трох участках. У выніку пажару знішчаны чатыры гаспадарчыя пабудовы і жылы дом. У двух дамах дачнікаў знішчаны дахі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Вынікі тыдня

# МОЦНАЯ МАТЫВАЦЫЯ



**Выбухі ў аэрапорце і ў метро, якія прагрымелі ў Бруселі 22 сакавіка** і ў выніку якіх загінула больш за 30 чалавек і паранена больш за 230, сталі чарговым шокам для Еўропы. Ужо ў першыя гадзіны пасля тэрактаў, калі яшчэ не былі сабраныя сур'ёзныя доказы, было відавочна, што галоўным падазраваным з'яўляецца тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава». Вельмі падобны быў почырк з тэрактамі ў Парыжы, здзейсненымі 13 лістапада 2015 года, — наяўнасць самагубцаў-смяротнікаў, адразу некалькі выбухаў з кароткім прамежкам паміж імі, арышты вінаватых у парыжскіх выбухах. У прыватнасці, 18 сакавіка 2016 года ў брусельскім прыгарадзе Маленбек-Сэн-Жан быў затрыманы Салах Абдэслам, якога лічаць галоўным арганізатарам тэрактаў у Парыжы, праведзеных ім ад імя «Ісламскай дзяржавы».

Тэракты, безумоўна, паўплываюць на дыскусію аб забароне смяротнага пакарання ў Еўропе. Усё больш грамадзян ЕС будуць настойваць на яе вяртанні ў якасці меры пакарання для тэрарыстаў. Але наўрад ці яе вернуць — большасць пагодзіцца з тым, што гэтая мера пакарання не напалохае тых, хто сам узрывае сябе з мэтай забіць людзей вакол.

На ўзроўні Еўрасаюза ізноў успыхне дыскусія **аб неабходнасці ўзмацніць супрацоўніцтва ў сферы бяспекі.** Як правільна паказвае Джанлука Дзі Феа ў артыкуле, апублікаваным у газеце La Repubblica 24 сакавіка, антытэрарыстычнае заканадаўства не аднолькавае ў 28 краінах ЕС, што дазваляе патэнцыйнаму камікадзэ выбіраць прытулак у Шэнгенскай зоне, дзе ён будзе чакаць моманту для нападу. Ёсць вельмі сур'ёзныя праблемы і з каардынацыяй па абмене інфармацыяй, і з жаданнем дзяліцца ёю паміж еўрапейскімі праваахоўнымі агенцтвамі. Для ЕС тое, што здарылася, стане матывацыяй узмацніць супрацоўніцтва з Беларуссю ў сферы бяспекі. У Еўрасаюзе яшчэ ў большай ступені стануць шанаваць тое, што беларускія ўлады затрымліваюць мноства падазроных замежнікаў, якія спрабуюць нелегальна ўехаць у ЕС, перарываюць спробы правозу ў ЕС зброі і выбухоўкі, эфектыўна змагаюцца з нелегальным транзітам наркотыкаў, якія з'яўляюцца адным з любімых спосабаў для тэрарыстаў усіх масцяў папоўніць фінансы.

Яшчэ больш **маштабны тэракт** з больш чым 70 ахвярамі адбыўся ў канцы тыдня **на тэрыторыі Пакістана,** хоць не даводзіцца сумнявацца, што на яго заходнія СМІ звернуць нашмат менш увагі. Выбух каля ўвахода ў парк з дзіцячай пляцоўкай, упадабаным месцы адпачынку сем'яў з дзецьмі, ажыццявіла арганізацыя «Джамаат-уль-Ахрара», звязаная з Талібанам. Галоўнай мэтай стала хрысціянская насельніцтва. На тэрыторыі правінцыі аб'яўлена трохдзённая жалоба.



Да канца тыдня адбылася важная падзея для сірыйскага ўрада. **Войскі прэзідэнта Асада змаглі цалкам вызваліць Пальміру.** Галоўная значнасць перамогі ў тым, што яна атрымана ўжо пасля пачатку вываду паветраных сіл Расіі, што стане доказам здольнасці ўрада атрымліваць важныя перамогі пры меншай, чым раней, ваеннай падтрымцы Масквы. Тым не менш расійскія самалёты пры вызваленні Пальміры былі таксама задзейнічаны. Са стратэгічнага пункту гледжання перамога таксама важная — вызвалены горад размешчаны на трасе, якая злучае Дамаск і ўсходнюю частку Сірыі. На жаль, Пальміра, якая была нядаўна найважнейшым помнікам гісторыі хрысціянства, панесла такія страты, што ніколі ўжо не стане ранейшай, хоць прэзідэнт Асад і паабяцаў аднавіць яе.

Шэраг важных для Беларусі міжнародных сустрэч і мерапрыемстваў прайшлі на тыдні ў Мінску. 22 сакавіка адбыліся **перамовы кіраўнікоў МЗС Беларусі і Польшчы** Уладзіміра Макея і Вітольда Вашчыкоўскага. Міністр замежных спраў Беларусі падкрэсліў гатоўнасць дзвюх краін да вырашэння пытанняў, якія накапіліся ў адносінах, адзначыўшы: «Мы разумеем, што нейкія пытанні павінны быць вырашаны хутчэй, нейкія крыху пазней, але самае галоўнае, што з абодвух бакоў, як мне здаецца, ёсць нацэленасць на вырашэнне гэтых пытанняў, нават кампраміснае, і нацэленасць на вынік і гатоўнасць да іх вырашэння. Гэта самае галоўнае».

23 сакавіка адкрыўся **Беларуска-грузінскі бізнес-форум.** Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, які прысутнічаў на адкрыцці, адзначыў, што тавараабарот дзвюх краін у 45 мільёнаў долараў недастатковы, у сувязі з чым трэба выходзіць на лічбу ў 200 мільёнаў долараў. Ён запрасіў грузінскі бізнес «да актыўнага выкарыстання магчымасцяў Беларусі, якія адкрываюцца ў сувязі з еўразійскай інтэграцыяй, новым «акном магчымасцяў» на заходнім кірунку і развіццём Беларуссю стратэгічнага ўсходняга вектара».

У сярэдзіне тыдня адбыўся **візіт у Беларусь намесніка прэм'ер-міністра — міністра замежных спраў Славеніі Карла Эр'яўца.** Сустрэчы на тэрыторыі Беларусі прайшлі ў вельмі сяброўскай атмасферы. Віцэ-прэм'ер зрабіў асаблівы акцэнт на тым, што Славенія заўсёды выступала супраць выкарыстання санкцый у дачыненні да Беларусі, і адзначыў, што яго краіна «вельмі шануе пазітыўную ролю Беларусі ў сваім рэгіёне, асабліва ў сувязі з крызісам на Украіне».

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Прыгожыя і моцныя

# ПАЧЭСНАЕ ЗВАННЕ, АДКАЗНАЯ МІСІЯ

## Жанчыны сёння могуць усё, але дужае мужчынскае плячо ім усё ж патрэбна

**35 нашых лепшых суайчынніц атрымалі на выхадных званне «Жанчына года 2015». Пачэсная ўзнагарода актывістак Беларускага саюза жанчын — сведчанне прызнання іх лідарскіх, працоўных і выхаваўчых якасцяў. Прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва ў каторы раз даказваюць, што могуць усё. А ўшанаванне пераможцаў VIII рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» стала сапраўдным прызнаннем іх заслуг.**

— Гэты конкурс знайшоў водгук не толькі ў жаночых сэрцах, а ва ўсёй нашай краіне, — адзначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Наша дзяржава — гэта краіна, дзе жанчыны — не толькі ўпрыгожванне, а і стрыжань дзяржавы. Моцнай краіна можа быць тады, калі ў ёй шчаслівыя жанчыны, прыгожая моладзь і дагледжаныя старыя.

Словы падзякі, павагі і віншаванняў прымалі пераможцы ў пяці намінацыях, самі назвы якіх тлумачаць сутнасць і разнастайнасць напрамкаў, у якіх працуюць і дасягаюць поспехаў сучасныя жанчыны. У гэты дзень мужчыны аднагалосна прызнавалі перавагу жанчын і іх першаснае значэнне ў жыцці дзяржавы.

**Міхаіл ЖУРАЎКОЎ, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь,** які ўзнагароджваў пераможцаў намінацыі «За выхаванне дзяцей і моладзі», прызнаўся, што нават крыху разгубіўся, увайшоўшы ў зал і ўбачыўшы адразу так шмат прыгажунь:

— На жанчыне трымаецца не толькі дзяржава, але і ўвесь свет. Куды мы, мужчыны, без вас дзенемся? Думаю, гэтая намінацыя асаблівая, бо выхаванне — вельмі важная місія. Мужчыны, магчыма, праз пэўную слабасць характару — аддаюць кіруючую ролю ў гэтай галіне жанчыне. Бо выхаваць сапраўднага чалавека — гэта самая галоўная місія на Зямлі, каб працягваўся наш род і каб квітнела наша дзяржава.



Фота Надзеі БУЖАН.

Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня БСЖ Марыяна ШЧОТКІНА і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Святлана ШЫЛАВА *(злева направа).*

Развагі пра значнасць жанчын у жыцці падтрымаў **генеральны дырэктар агракамбіната «Ждановічы» Георгій ЧУЙКО,** якому выпала віншаваць пераможцаў намінацыі «За ўклад у развіццё сяла».

— Усё, што мужчыны робяць у жыцці, робіцца для жанчын. А ўзамен яны атрымліваюць усё роўна больш. Бог даў нам зямлю, неба, паветра, а ўсё астатняе для жыцця чалавека ствараюць сялянскія жаночыя рукі. Раней мы змагаліся за адраджэнне сяла, а цяпер — за развіццё, і гэта ўжо больш высокая ступень. Упэўнены, што пры такіх жанчынах будучае сяла забяспечана.

Вітаючы жанчын, адзначаных у катэгорыі «За ўклад у развіццё духоўнасці і культуры», **генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПРАКАПЦОЎ** далучыўся да думак астатніх мужчын:

— Мы толькі кіруем, а асноўную працу ў сферы культуры ўсё ж такі робяць жанчыны.

Ён прапанаваў на наступны год пашырыць склад намінацыі, дадаўшы ў яе яшчэ і катэгорыю мастацтва, дзе працуе шмат жанчын.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу,** які ўшаноўваў пераможцаў катэгорыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва», прапанаваў стварыць яшчэ адну намінацыю: «Лідар у навуцы і адукацыі».

— Нашы дамы робяць магутны ўклад менавіта ў гэтыя галіны, — зазначыў ён.

Знакавую і значную працу грамадскіх аб'яднанняў для краіны падкрэсліла **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА,** віншуючы пераможцаў намінацыі «Паспяховы старт і надзея Беларускага саюза жанчын».



Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА ўзнагароджвае пераможцаў намінацыі «Паспяховы старт і надзея БСЖ».

— Вы не толькі самааддана працуеце на сваіх месцах, ведзяце вялікую грамадскую працу, але і застаяцеся мамамі, сёстрамі, сяброўкамі. Мы яшчэ раз пераканаліся, што жанчыны могуць усё.

Прыгожыя, моцныя, здольныя і таленавітыя беларускія жанчыны не засталіся ў даўгу ў мужчын і падзякавалі ім за падтрымку і разуменне.

— Гісторыя краіны ніколі не абыходзіцца без удзелу жанчын, якія заўжды наперадзе. Аднак побач з намі заўсёды мужчыны, і мы ўдзячны ім за ўвагу і цярпенне нашых капрызаў, за павагу і любоў, — падзякавала моцнай палове **Марыяна ШЧОТКІНА, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».**

— Мы сёння такія прыгожыя не толькі дзеля аднаго свята. Мы заўжды робім прычоску і макіяж дзеля мужчын, каб яны намі ганарыліся і захапляліся. Побач заўжды павінна быць моцнае плячо, на якое мы можам абаперціся, — запэўніла нязменная **кіраўніца ААТ «Вялікі Двор» у Стаўбцоўскім раёне Вольга ЛУЦЫК.** — Жанчына — гэта перш за ўсё маці, а потым — бабка. Усё, што ўва мне ёсць добрага, — гэта ад Бога і ад бабулі. У 1941-м, калі я нарадзілася, мая мама будавала камунізм, а бабуля была са мной. Цяпер я таксама маю ўнукаў і прашу Бога, каб ён дазволіў мне дачакацца яшчэ і праўнукаў.

— Такія ўзнагароды натхняюць на новыя подзвігі. Хочацца зрабіць яшчэ нешта новае, карыснае. Увага вельмі патрэбна жанчынам і ад мужчын, і ад краіны, і ад жанчын, — пераканана **Маргарыта АЛЕКСАНДРОВІЧ, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, салістка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.** — Калі мы звяртаем на сябе ўвагу справамі, мужчыны яшчэ больш цэняць нас за актыўнасць, прадпрымальнасць, творчасць. У сучасным свеце мужчыны і жанчыны павінны падтрымліваць адно аднаго без усялякіх спаборніцтваў (хіба што толькі ў добрым сэнсе, каб актывізавацца на новыя перамогі і дасягненні).

— Можа здацца, што грамадская дзейнасць — цяжкая праца, але рабіць яе лёгка, бо мне асабіста дапамагаюць муж, дзеці і ўсе неабыякавыя. Калі справа любімая, яна не патрабуе шмат намаганняў і становіцца цікавай і натхняльнай, — падзялілася **Ірына ПІЛІПЧУК з Ганцавіч, маці дзесяці дзяцей, загадчыца царкоўнай бібліятэкі храма ў гонар святіцеля Ціхана, Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі.**

— Гэта шчасце, што мы такія. Бывае, праўда, што мужчыны праз нас ваююць, але колькі свята, дабрыні, карысці і цяпла мы нясём у свет! Без жанчыны не абыходзіцца ніводная справа, напэўна, таму што мы свята ў акенцы, — дадала **Наталля ЦЫЛІНСКАЯ, веласпартсменка, заслужаны майстар спорту Беларусі, васьміразовая чэмпіёнка свету і маці чацвярых дзяцей.**

**Ірына СІДАРОК,**
*sidarok@zviazda.by*

■ Святло ў акне

# У ТЭХНІЦЫ НАДЗЕІ

## Шэдэўры з пяску, пасты, керамікі і фарбаў стварылі маленькія пацыенты хоспіса



Цяпер Вольга лепш разумее, што адчуваюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

**АБ'ЁМНЫЯ карціны з элементамі мазаікі выставы «Ляці-ляці, пялёстак» — сама па сабе арыгінальная задума. Аднак унікальнасць яе ў тым, што творы выкананы дзецьмі, якія фізічна не маглі перадаць на палатне свае фантазіі. Дапамагалі рэалізаваць ідэі падапечных Беларускага дзіцячага хоспіса выхаванцы студыі «Флорыя» пры Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства.**

Выніковая праца ўражвае, натхняе, узрушвае. Глядзіш, і найперш бачыш фарбы, пасля разглядаеш узоры, потым звяртаеш увагу на інкрустацыю цудоўнымі пялёсткамі і кавалачкамі керамікі. Праз нейкі час здагадваешся, што гэта не проста абстракцыя — у колерах схаваны выявы: ракавінка, рыба, дрэва, жар-птушка... Кожны бачыў на палатне тое, што падказвалі розум і сэрца.

На адкрыцці выставы сабраліся асноўныя ўдзельнікі праекта. Тыя, хто праз пэўныя фізічныя цяжкасці не змог далучыцца, прымалі ўдзел у сустрэчы праз інтэрнэт.

— Мы прапаноўваем гасцям выставы разглядзець карціны з самага зручнага ракурсу — на ўзроўні каляскі, на якой рухаюцца нашы падапечныя, — адзначыла **Ганна ГАРЧАКОВА, дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса.** — Праект ствараўся, каб паказаць, што гэтыя дзеці МОГУЦЬ. Яны шмат чаго могуць: не толькі тварыць, а і дапамагаць ствараць нешта агульнае.

Перш чым прыйсці да такога праекта, навучэнцы студыі «Флорыя» праводзілі для дзяцей з хоспіса майстар-класы. Яны разам малявалі на вадзе, тварылі пяском і фарбамі.

— Даць нейкую назву тэхніцы, у якой створаны карціны, складана, бо гэта часткова было нейкае хуліганства, часткова — спроба, фантазія, таму мы не абмяжоўваліся ніякімі стандартамі, — патлумачыла **мастачка Людміла БАЙРАВА, кіраўнік студыі «Флорыя».** — Мы карысталіся акрылавымі фарбамі, кварцавым пяском, тэкстурнай пастай і элементамі керамікі і атрымалі, упэўнена, сапраўдныя шэдэўры.

На палотнах суседнічаюць гліна, кераміка і алейныя фарбы. У цэнтры кожнай карціны — керамічны пялёстак, які ўмела ўплецены ў асноўную тэму. Кожны з прысутных спадзяецца, што як у той казцы пра сямікветкавую кветачку, загаданыя дзецьмі жаданні збудуцца і тут.

— Калі нашы дзеці рабілі першыя мазкі, гэта быў толькі першы слой, які пасля дапрацоўваўся выхаванцамі студыі «Флорыя». У выніку атрымаліся шыкоўныя карціны. Я думала, што аўтары ідэй пасля гэтага не пазнаюць сваю работу, але ўсе дзеці як адзін накіраваліся кожны да свайго палатна, — узрушана ўспамінае **Ірына БАЙДАКОВА, спецыяліст па сацыяльнай рабоце Беларускага дзіцячага хоспіса.**

Для кагосьці мерапрыемства стала эксперыментам, а для кагосьці — адкрыццём. Гасцям выставы прапанавалі намаляваць карціну, прывязаўшы іх рукі за локці да тулава, каб яны змаглі на сабе адчуць цяжкасці, з якімі сутыкаюцца дзеці, магчымасці якіх таксама абмежаваны.

— Вельмі дзіўна было маляваць з завязанымі рукамі. Мае рухі сталі скаванымі. Хочацца дацягнуцца ўперад, павярнуць руку, як табе зручна і як ты прывык, а не атрымоўваецца, — падзялілася ўражаннямі ад «абмежавання» малявання кветкі наведвальніца Вольга. — Цяпер я больш разумею, што адчуваюць дзеці, якія не маюць магчымасці нармальна рухацца. Адна справа глядзець на цудоўныя карціны, а іншая — на сабе адчуць, як гэта, калі ты фізічна не можаш зрабіць тое, што хочаш.

Другі госць, Ілья, які маляваў сіняга слана пад дажджом, настолькі захапіўся працэсам, што палітру і пэндзаль трымаў нават зубамі, бо не хапала рук на ўсе дзеянні.

Пасля заканчэння выставы работы дзяцей будуць выстаўлены на аўкцыён. За вyручаныя сродкі арганізатары мяркуюць набыць абсталяванне ў новы будынак дзіцячага хоспіса.

Выстава працуе ў арт-прасторы «ЦЭХ» па вул. Кастрычніцкай,16 з 24 сакавіка па 12 красавіка з 12:00 да 22:00. Уваход вольны.



Каця і Рома — актыўныя ўдзельнікі праекта.

**Ірына СІДАРОК. Фота аўтара.**
*sidarok@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000001013436, площадью 0,0903 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Туловский, №9 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Начальная цена**: 247 665 748 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №240100000002009175, площадью 0,0842 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, №19 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 180 424 384 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №240100000002009174, площадью 0,0833 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Чепинская, №21 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена**: 178 498 068 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 29.04.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 29.03.2016 с 8.30 по 28.04.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 ф-л №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). **Для участия в аукционе** гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр.лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; срок выполнения работ подготовке проектной документации не более одного года; разработать ПСД в соответствии с действующими ТНПА; согласовать ПСД с главным архитектором города Витебска; при необходимости произвести гос. экспертизу ПСД; получить разрешение на строительство объекта, в т.ч. при необходимости удаления, пересадки объектов растительного мира до начала строительных работ получить разрешение на произведение компенсационных посадок либо осуществление компенсационных выплат в соответствии с ПСД; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация»

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 28 апреля 2016 г. в 11.00 состоятся ОТКРЫТЫЕ аукционные торги по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности СООО «Стилус» (продавец), в составе: Лота № 1 (предмет торгов): Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-53377 (нежилое помещение № 133) общ. пл. 41,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369) |
| **Продавец предмета торгов** | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Стилус», УНП 190568178 (220117, г. Минск, пр-т Любимова, 26/3, р/с 3012009326015 рубли РБ, р/с 3012009326510 EURO, USD, RUB в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 101 код 749 г. Минск, ул. Тимирязева, 65А |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 480 000 000 рублей, размер задатка – 5%, что составляет – 24 000 000 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Характеристика текущего состояния предмета торгов** | Помещение расп. в 2-этажном кирп. здании, г.п. 1946, реконстр. – 1989, перекрытия ж/бет., полы бетон., имеются: центр. отопл., электроснабжение |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (Двадцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | **по 25 апреля 2016 г. включительно до 16.00** |

**Для участия в торгах в адрес Организатора торгов необходимо предоставить**: заявление на участие в торгах; документ с отметкой банка, подтверждающий о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет; паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Резидентам Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям** – свидетельство о государственной регистрации; **юридическим лицам** – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации); **представителю физического лица и индивидуального предпринимателя** – нотариально заверенную доверенность.

**Нерезидентам Республики Беларусь:** иностранным юридическим лицам, иным организациям – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; индивидуальным предпринимателям – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителю иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иностранной организации – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.

**Порядок проведения торгов**: шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку), будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**. Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным.

**Победитель (Претендент на покупку**) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ с 1 января 2015 г. по 31 декабря 2015 г.

| | |
|---|---|
| **Организация** | **ОАО «Белхимэнерго»** |
| **Учетный номер плательщика** | 100363932 |
| **Вид экономической деятельности** | Строительно-монтажные работы |
| **Организационно-правовая форма** | Открытое акционерное общество |
| **Орган управления** | Концерн «Белнефтехим» |
| **Единица измерения** | млн. руб. |
| **Адрес** | 220024, г. Минск, пер. Асаналиева, д. 3 |

### Бухгалтерский баланс на 31.12. 2015 г.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 32 927 | 34 122 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 | 10 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **32 930** | **34 132** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2 469 | 783 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 2 336 | 734 |
| готовая продукция и товары | 214 | 133 | 49 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 184 | 158 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2 960 | 3 495 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 13 880 | 12 000 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 954 | 2 200 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | | 1 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **22 447** | **18 637** |
| **БАЛАНС** | **300** | **55 377** | **52 769** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2015 года** | **На 31 декабря 2014 г.** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 394 | 394 |
| Резервный капитал | 440 | 43 | 43 |
| Добавочный капитал | 450 | 41 606 | 41 832 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 10 901 | 8 021 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **52 944** | **50 290** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 114 | 711 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **1 114** | **711** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 319 | 1 768 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 322 | 167 |
| по авансам полученным | 632 | 28 | 9 |
| по налогам и сборам | 633 | 515 | 1 031 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 61 | 104 |
| по оплате труда | 635 | 338 | 418 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 28 | 23 |
| прочим кредиторам | 638 | 27 | 16 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 319** | **1 768** |
| **БАЛАНС** | **700** | **55 377** | **52 769** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2015 года | За январь-декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 23 148 | 22 012 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (9 775) | (8 539) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 13 373 | 13 473 |
| Управленческие расходы | 040 | (10 355) | (10 722) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | 3 018 | 2 751 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 153 | 44 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (650) | (362) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 2 521 | 2 433 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 481 | 361 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 360 | 95 |
| проценты к получению | 103 | 121 | 265 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | | 1 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (205) | (107) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (205) | (95) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | | (12) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 575 | 311 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1 573 | 131 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 2 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 017) | (154) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (6) | (3) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (1 011) | (143) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | | (8) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | 834 | 411 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 3 355 | 2 844 |
| Налог на прибыль | 160 | (689) | (576) |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 2 666 | 2 268 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | | 2572 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 2 666 | 4 840 |

Доля государства в уставном фонде эмитента ОАО «Белхимэнерго» (всего, в процентах), в том числе:

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | 0 | 0 |
| Коммунальная – всего | 0 | 0 |
| В том числе: областная | 0 | 0 |
| районная | 0 | 0 |
| городская | 0 | 0 |

Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателей | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 885 | 885 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 3 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 883 | 883 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 11,3 | 2,6 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 4,8 | 1,2 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 50,4 | 11,9 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 1,34 | 0,32 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 235,23 | 202,00 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Отдельные финансовые результаты:

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 23148 | 22012 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 20130 | 19261 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | миллионов рублей | 3355 | 2844 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 3018 | 2751 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | миллионов рублей | -497 | -318 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | миллионов рублей | 834 | 411 |
| Налоги на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | миллионов рублей | 689 | 576 |
| Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | 2666 | 2268 |
| Нераспределенная прибыль(непокрытый убыток) | миллионов рублей | 10901 | 8021 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | миллионов рублей | 1114 | 711 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 96 | 96 |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): ремонтные, монтажные и наладочные работы.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2015 год, – 25.03.2016 г.

Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): с правилами корпоративного поведения ознакомлены.

По мнению аудитора бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Белхимэнерго» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белхимэнерго» по состоянию на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

**Годовой отчет за 2015 год** УНП 100185330

## Открытое акционерное общество «ПРОМТЕХМОНТАЖ»

**220012, г. Минск, пер. Калининградский, 19а**

### СВОДНЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

Единица измерения: млн руб.

| АКТИВ | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Основные средства | 213446 | 221162 |
| Нематериальные активы | 297 | 235 |
| Долгосрочные активы и финансовые вложения | 28428 | 23007 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **242171** | **244404** |
| **II. Краткосрочные активы** | | |
| Запасы | 266114 | 202361 |
| Расходы будущих периодов | 1704 | 19694 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 2331 | 1622 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 313641 | 274661 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 10714 | 60 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 61898 | 54192 |
| Прочие краткосрочные активы | 144 | 141 |
| **ИТОГО по разделу II** | **656546** | **552731** |
| **БАЛАНС** | **898717** | **797135** |
| **ПАССИВ** | | |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | |
| Уставный фонд | 41251 | 41251 |
| Резервный капитал | 15926 | 15273 |
| Добавочный капитал | 186584 | 187000 |
| Нераспределенная прибыль | 305612 | 248502 |
| **ИТОГО по разделу III** | **549373** | **492026** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **70** | **47** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **349274** | **305062** |
| **БАЛАНС** | **898717** | **797135** |

### СВОДНЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателей | За январь-декабрь 2015 г. | За январь–декабрь 2014 г. |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 1483909 | 1341540 |
| Себестоимость реализованных продукции, товаров, работ, услуг | 1233643 | 1117874 |
| Валовая прибыль | 250266 | 223666 |
| Управленческие расходы | (101138) | (80564) |
| Расходы на реализацию | (2007) | (1859) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 147121 | 141243 |
| Прибыль от текущей деятельности | 108565 | 110944 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 13405 | (13415) |
| Прибыль до налогообложения | 121970 | 97529 |
| Налог на прибыль | (27619) | (22737) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | (15785) | (6137) |
| Чистая прибыль (убыток) | 78566 | 68655 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | – | – |
| Совокупная прибыль | 78566 | 68655 |

**Информация об открытом акционерном обществе**

Количество акционеров: всего – 6616,
в т.ч. юридических лиц – 1, из них нерезидентов – нет;
физических лиц – 6615, в т.ч. нерезидентов – 12.
Доля государства в уставном фонде – 61,418%

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Ед. измер. | За отчетный период | За аналог. период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 25345 | 21171 |
| Дивиденды, приходящиеся на 1 акцию (включая налоги) | руб. | 11059,29 | 9238 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 239,719 | 215,164 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | шт. | – | – |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 2 562.

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: Прочие строительные работы, требующие специальных профессий – 622 564 млн руб. (63,4%). ОКЭД-45252.

Выплата дивидендов физическим лицам производится с 01.07.2016 г. по 31.10.2016 г.

Право на получение дивидендов имеют акционеры, включенные в Реестр акционеров на 01.03.2016 г.

Общее собрание акционеров, утвердившее годовой баланс за 2015 год, состоялось 24 марта 2016 года.

Эмитентом применяются в работе правила корпоративного поведения.

Аудиторское заключение (мнение) ООО «Аудит и управление»: «По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» за 2015 год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

Генеральный директор И.В.Сенокосов
Главный бухгалтер Т.Г.Михневич

# «ХАЧУ СВАБОДНЫ ГРАФІК, І КАБ БЫЛО ЦІКАВА...»

## Актуальная тэма для рынку працы — узаемадзеянне паміж наймальнікам (як дзяржаўным, так і прыватным) і персаналам



**На што сёння ідуць работадаўцы? Рэзка звальняюць/скарачаюць кадры, як гэта было некалі або спрабуюць прыстасавацца да змены сітуацыі не такімі радыкальнымі спосабамі?**

**У бізнесу сёння дакладна ёсць выбар, а вось у шэрагах кадраў з'явілася падзабытая канкурэнцыя. Праўда, пакуль адны наймальнікі схільныя расцэньваць сітуацыю як не надта змененую («гром яшчэ не грымнуў»), у іншых ужо нарадзіўся неканструктыўны страх, які праяўляецца па формуле «бягу туды — невядома куды, бяру тое, што даюць». Знаўцы кажуць, што ў складаныя для эканомікі часы абедзве пазіцыі пройгрышныя. Галоўнае — цвярозая развага: у чым мая ўнікальнасць? Спецыялісту па знешнеэканамічнай дзейнасці варта ўжо адмаўляцца ад ілюзіі кшталту: «Хачу свабодны графік і вярнуць цікавыя праекты!» і пачынаць думаць, як палепшыць сваю дзейнасць на сваім месцы або якім чынам заняць сябе ў вызвалены час. Сваімі развагамі наконт прыярытэтаў на рынку працы дзеляцца эксперты — кіруючы партнёр міжнароднай юрыдычнай фірмы Cobalt у Беларусі Дар'я ЖУК і кіраўнік беларускага офіса міжнароднай кампаніі Pedersen&Partners Лола ТРАПШ.**

### ПРЭМІЯ Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ

**Дар'я ЖУК:** — Рынак працы сёння стаў больш наймальніцкім — колькасць звольненых перавышае колькасць прынятых на працу. Першымі ў няпростыя часы ўдар прымаюць такія галіны дзейнасці, як прамысловасць, аптовы гандаль і будаўніцтва.

**Лола ТРАПШ:** — У 2008—2009 гадах, пры змяненні эканамічнай сітуацыі ў горшы бок, першай рэакцыяй беларускіх кампаній (мы кажам, безумоўна, і пра дзяржаўныя структуры таксама — проста хутчэй заўсёды рэагуе прыватны сектар) было рэзкае скарачэнне персаналу. Аб'ёмы бізнесу яшчэ нават не пачалі скарачацца, а персанал ужо пацярпеў. Далей такія рашэнні прымаліся ўжо больш узважана, а сёння такую актыўнасць наогул імкнуцца стрымліваць. Наймальнікі навучыліся дамаўляцца, вызначаць, на якую колькасць работы якая колькасць персаналу патрэбна. Відавочна, у складаны час нехта можа нават прырасці, і некаторыя кампаніі з гонарам кажуць, што працуюць у штатным рэжыме і ў «плюсе». Дагаворы з персаналам, перагляд сваіх стасункаў з ім, скарачэнні, аптымізацыя — усё адбываецца галоўным чынам па згодзе бакоў. Асноўныя дамовы датычацца перагляду ўзроўню заробкаў — гэта, можа быць, напрыклад, адкладванне бонусаў на перспектыву, да лепшых часоў.

**Д. Ж.:** — Да нас паступае нямала запытаў адносна аптымізацыі сістэм аплаты працы. Як перайсці ад фіксаванай сістэмы аплаты да больш гібкай? Варыянтаў мноства. Скажам, заробак дагэтуль складаў 100 у.а., 80 пры гэтым былі фіксаванымі, а 20 прэміяльнымі. Цяпер зусім наадварот — 80 будуць складаць прэміі і надбаўкі. Такім чынам супрацоўнік максімальна ўцягваецца ў працэс атрымання прыбытку, развіцця кампаніі. Аднак калі гэта юрыдычна не замацавана, то няма ніякіх гарантый, што кожны выканае свае абавязкі. Прапісаць новыя ўмовы можна на лакальным узроўні — акты, службовыя інструкцыі, пагадненні, дагаворы, палажэнні аб прэміраванні, аб аплаце працы, дадатак да кантракту і г.д. Гэта можа быць і дагавор аб намерах — дакумент, які пацвярджае, што аднойчы работнік атрымае сваё. Так, наймальнік можа прапанаваць работніку дапамагчы сёння «выцягнуць» бізнес узамен на тое, што заўтра атрымае пэўную долю ад яго. Прэмія можа быць (і гэта таксама можна прапісваць у дакументах) грашовай, таварнай і нават маёмаснай (выканаеш задачу — атрымаеш офіснае памяшканне). Можа быць і адкладзенае ўзнагароджванне — прэмія, якая закладваецца ў залежнасці ад выніку ў будучыні.

**Л. Т.:** — Размова можа ісці і аб пераглядзе стратэгічных мэт — мы хочам пратрымацца ці прарваца? І тады разглядаюцца структурныя змены: могуць звольніць аднаго дарагога менеджара і наняць двух сярэдніх або звольніць двух сярэдніх і ўзяць аднаго моцнага. Новы трэнд — унутранае працаўладкаванне, калі наймальнік дамаўляецца з работнікам аб яго іншым функцыянале, новых умовах, дае магчымасць зарабіць дзесьці яшчэ. Вялікія намаганні затрачваюцца на стварэнне атмасферы — усё для персаналу, нават магчымасці навучання, каб калі і выпусціць, то падрыхтаваным.

**• По афіцыйных звестках**

### НА АДНУ ВАКАНСІЮ...

**✓ У студзені-лютым у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнуліся 36,8 тысячы чалавек (90 працэнтаў да студзеня-лютага 2015 года). Каля 32 тысяч з іх зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных. З улікам грамадзян, якія сталі на ўліку на 1 студзеня гэтага года, усяго мелі патрэбу ў працаўладкаванні 86 тысяч, з якіх беспрацоўныя — 75 тысяч.**

**✓ Узровень зарэгістраванага беспрацоўя складае 1,1 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.**

**✓ Попыт на працоўную сілу, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, павысіўся. На канец лютага ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне паступілі звесткі аб 28,5 тысячы вакансій (107 працэнтаў да ўзроўню 2015-га). Патрэба па рабочых прафесіях склала 47 працэнтаў ад агульнай колькасці вакансій. Наогул, колькасць вакансій па рабочых прафесіях зніжаецца, а патрэба ў спецыялістах расце.**

**✓ Колькасць беспрацоўных на ўліку ў органах па занятасці на 1 сакавіка — 51 тысяча, што фактычна ў паўтара раза больш, чым на 1 сакавіка мінулага года.**

**✓ На адну вакансію 1 сакавіка прыпадала 1,8 беспрацоўнага (1 студзеня было 0,7).**

### НОВАЕ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ

**Д. Ж:** — Апошнія змены, унесеныя ў Працоўны кодэкс напрыканцы 2014 года, дазваляюць выкарыстоўваць з мэтай аптымізацыі затрат шэраг магчымасцяў. Гэта надомная праца, калі штатны работнік знаходзіцца дома, або, скажам, новы від сумяшчальніцтва, пры якім можна быць задзейнічаным не на палову дня, як раней, а на цэлы працоўны дзень... Работадаўца цяпер абавязаны цягам двух месяцаў, праз якія плануецца звольніць работніка, прапаноўваць работніку вакансіі, перападрыхтоўку.

Дадатковыя падставы для звальнення кіраўніка прадпрыемства замацаваў Дэкрэт №5: парушэнне вытворча-тэхналагічнай выканаўчай і працоўнай дысцыпліны, незабеспячэнне належных умоў працы работнікам, утрыманне вытворчых будынкаў у неналежным стане. Крытэрыі даволі суб'ектыўныя, але тым не менш. Трэба памятаць і пра Пастанову «Аб удасканаленні ўмоў аплаты працы кіраўніка арганізацыі ў залежнасці ад вынікаў фінансава-гаспадарчай дзейнасці», якая ўвяла «каэфіцыент восем». Так, суадносіны сярэднегадавога заробку па прадпрыемстве і сярэднегадавога заробку кіраўніка павінны складаць 1:8. Тут не можа быць невераготнага разрыву: інакш кажучы, хочаш атрымліваць вялікі заробак, намагайся, каб тваё прадпрыемства працавала добра... І кіраўнікоў, і работнікаў датычыцца змяненне тэрміну папярэджвання аб скарачэнні заробку — цяпер гэта 7 дзён, а не 1 месяц.

### БЕЗ ЭКСПАТАЎ НЕ АБЫСЦІСЯ

**Д. Ж.:** — Што да працоўнай міграцыі, то, папершае, да нас вяртаюцца нашы грамадзяне, якія працавалі дагэтуль у той жа Расіі ці ва Украіне, але едуць і грамадзяне іншых краін. Паводле дзейнага заканадаўства, перш чым прыняць на працу замежніка, кампанія абавязана паведаміць пра вакансію, на якую дзяржава мае права накіроўваць спачатку мясцовы персанал. Цікава, што на практыцы гэта ўжо не фармальны працэс, як было раней. Калі чалавек не дайшоў, пра гэта трэба паведаміць у дзяржорганы.

У дачыненні да замежнай працоўнай сілы з ліпеня гэтага года пачне дзейнічаць новая норма. Для таго, каб прыняць на працу высокакваліфікаванага спецыяліста з-за мяжы — з вышэйшай адукацыяй, вопытам работы на кіруючых пасадах — трэба атрымаць на яго станоўчае заключэнне. Калі ў кампаніі ёсць намер узяць на работу звыш дзесяці замежных работнікаў, давядзецца браць асобны дазвол для самой кампаніі, а пасля ўжо і на гэтых работнікаў.

А з 1 студзеня гэтага года дзейнічае норма адносна сацыяльнага ўзносу замежнага супрацоўніка — 35 працэнтаў ад сумы ўтрымліваецца ў мясцовы Фонд сацыяльнай абароны. Раней гэта быў не абавязак, а права. Наогул гэта будзе ісці ў залік у той краіне, адкуль прыехаў работнік, калі размова пра краіны СНД (паміж імі існуюць пэўныя дамоўленасці).

**Л. Т.:** — Топ-менеджары, якія прыязджаюць не толькі з блізкага замежжа, нам вельмі неабходны, бо яны вязуць з сабой значны вопыт дасягнення поспеху, а ў нас яго няма па аб'ектыўных прычынах. Таму мы выкарыстоўваем іх прыцягненне як узмацняльнік працэсу, і ў тым ліку для навучання. Так, апошнім часам імкліва пачаў развівацца фаст-фуд, але ў нас няма багатага вопыту ў гэтым бізнесе. У нейкім высокаканкурэнтным асяроддзі таксама можна вырвацца выключна за кошт нейкіх прафесійных ведаў, прывезеных аднекуль, з буйных і праверaных сістэм. А ў міжнародных кампаніях наогул некаторыя пазіцыі часам павінны быць заняты экспатамі (ад лац. «па-за радзімай»).

Яшчэ ў лютым наша кампанія (а ў нас 56 офісаў па ўсім свеце) адчула сур'ёзную цікавасць з боку суседніх, у тым ліку еўрапейскіх, краін. Сітуацыя з адменай санкцый паўплывала на магчымасць разгляду рашэння прыйсці сюды. Практыка паказвае, што замежнікі доўга думаюць, ці ісці, а пасля адзначаюць, што тут камфортна працаваць... Магчыма, надалей сітуацыя не будзе простай, але перспектывы ёсць заўсёды. Пераадольванне любых цяжкасцяў — гэта пошук новых магчымасцяў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# Ёсць рэзервы павышэння эфектыўнасці

**Днямі ў Светлагорску адбыўся семінар, прысвечаны зніжэнню выдаткаў на вытворчасць прадукцыі раслінаводства пры правядзенні вясенне-палявых работ. Такія мерапрыемствы, якія навучаюць укараненню новых энерга- і матэрыялазберагальных тэхналогій у сельскай гаспадарцы, стануць на Гомельшчыне рэгулярнымі.**

У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама расказалі, што спецыялісты галіны распрацавалі грунтоўную праграму рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 78 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь».

Перад арганізацыямі аграпрамысловай галіны пастаўлена задача адшукання рэзерваў для зніжэння ўзроўню выдаткаў па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на 25%. Ужо распрацаваны дэталёвыя планы захадаў па аптымізацыі выдаткаў. Размова ідзе, напрыклад, пра забеспячэнне збалансаванага і своечасовага ўнясення мінеральных угнаенняў у адпаведнасці з запланаванай ураджайнасцю і ўрадлівасцю глеб, апрацоўку пасеваў сродкамі абароны паводле патрабаванняў тэхналагічных рэгламентаў. Важнай з'яўляецца аптымізацыя сартавога падбору сельскагаспадарчых культур з улікам тэрмінаў пасявання, устойлівасці да кліматычных умоў надвор'я, глебавых разнавіднасцяў.

Спецыялісты сельскагаспадарчай галіны звяртаюць увагу на шырокае ўжыванне шматаперацыйнай тэхнікі, недапушчэнне выпадкаў выкарыстання энерганасычаных трактароў у агрэгаце з нізкапрадукцыйнымі машынамі. Дарэчы, падчас правядзення сёлетніх палявых работ будзе арганізавана двухзменная праца энерганасычанай тэхнікі. Ідзе гаворка і пра аптымізацыю транспартных маршрутаў, укараненне навігацыйных сістэм і памяншэнне парожняга прабегу аўтамабіляў, максімальнае выкарыстанне грузападымальнасці аўтатранспарту...

Можна вышукаць рэзервы для эканоміі, калі ліквідаваць неабгрунтаванае пасярэдніцтва ў набыцці сыравіны, матэрыялаў, а таксама пры пастаўцы гатовай прадукцыі гандлёвым арганізацыям. Трэба працягваць работу па ўцягванні ў гаспадарчы абарот ці, наадварот, вывядзенні з абароту той маёмасці, якая па розных прычынах не выкарыстоўваецца. Сёлета будзе працягнута работа па рэфармаванні неплацежаздольных, стратных гаспадарак, а таксама тых, што неэфектыўна працуюць.

Летась прадукцыя прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці пастаўлялася ў 20 краін свету. Цяпер прымаюцца заходы, каб павялічыць колькасць краін-спажыўцоў нашых прадуктаў. Для гэтага спецыялісты аграпрамысловага комплексу паўднёвага рэгіёна краіны сёлета прымуць удзел у выставах і кірмашах у многіх краінах свету.

Зараз ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Гомельская мяса-малочная кампанія» вядзе перамовы па пастаўках малочнай прадукцыі ў некалькі правінцый Кітая. Акрамя таго, у Інданезію для даследавання адпраўлены ўзоры сухога абястлушчанага і суцэльнага малака. Таксама гэтае таварыства плануе стварыць дылерскую сетку ва Узбекістане, пашырыць дылерскія сеткі ў Казахстане і Расійскай Федэрацыі. Большую колькасць сыроў з Гомельшчыны пакаштуюць спажыўцы ў Кыргызстане, Азербайджане, Арменіі, Грузіі... Прадпрыемствы холдынга «Гомельхлебапрадукт» вядуць перамовы аб павелічэнні паставак мукі ў Македонію, Малдову і Украіну, а ААТ «Камбінат «Усход» пачаў ажыццяўляць экспарт агародніны ў Румынію і Малдову. Птушкафабрыкі вобласці вядуць перамовы аб пастаўках яек курыных і мяса птушкі ў Ірак, Казахстан і Балканскі рэгіён.

Каб наладжваць новыя кантакты і прасоўваць прадукцыю на экспарт, прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу Гомельшчыны рэгулярна рассылаюць камерцыйныя прапановы патэнцыйным контрагентам у краіны Азіі, Афрыкі і Кітая, выкарыстоўваюць электронныя і інтэрнэт-пляцоўкі (Беларуская ўніверсальная біржа, meatinfo, Allbiz і г.д.), узаемадзейнічаюць з унітарным прадпрыемствам «Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн» і Беларускай гандлёва-прамысловай палатай.

Пералічаныя мерапрыемствы, упэўнены у камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, а таксама прырост прадукцыі сельскай гаспадаркі ў сельскагаспадарчых арганізацыях не менш як на 8% па выніках 2016 года дазволяць забяспечыць рэалізацыю патрабаванняў кіраўніка дзяржавы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже конфискованного имущества Ошмянского района 19 апреля 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена с НДС (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*. | Капитальное строение с инвентарным номером 442/С-364 | Гродненская область, Островецкий район, Ворнянский сельский Совет, д. Больники, д. 41 | 23 976 000 | 2 390 000 | без условий | Здание расположено на земельном участке с инвентарным номером 424680403101000053 площадью 0,2501 га. Бревенчатый сборно-щитовой дом |

** – Лот продается по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Ошмянском райисполкоме.*

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, тел.: (0152) 720537, 720546.**

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10%.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

